# Чытанне як падмурак творчасці

У наш час адбываюцца дынамічныя змены ў жыцці грамадства. І сярод розных сфер даволі значныя яны і ў адукацыйнай сферы. Развіццё Інтэрнэта і лічбавых тэхналогій актыўна ўплывае асабліва на дзяцей і падлеткаў, набывае для іх дамінуючую значнасць. У сувязі з гэтым сёння ідзе гаворка аб пазітыўным і негатыўным уплыве працэсаў лічбавай трансфармацыі ў адукацыі. Станоўчага, безумоўна, шмат. Трывогу ж выклікае зніжэнне развіцця ў вучняў уменняў аналізу, пераасэнсавання, даследвання і ператварэнне творчага пазнавальнага працэсу ў павярхоўнае здабыванне і засваенне інфармацыі. Праяўляюцца праблемы і ў маўленчай дзейнасці. Адна з прычын – захопленасць гаджэтамі, якія падлеткамі літаральна не выпускаюцца з рук. Назіраецца паступовае змяншэнне непасрэдных жывых зносін – найважнейшай умовы набыцця навыкаў дасканалага камуніцыравання. А яшчэ на сённяшні час не без падстаў выказваецца заклапочанасць зніжэннем ролі чытання. Роля чытання, а тым больш удумлівага чытання папяровых кніг, у пераважнай большасці сучасных падлеткаў стаіць на апошніх пазіцыях. Нельга сказаць, што яны зусім не чытаюць. Чытаюць, але пераважна ў лічбавым фармаце. Зразумела, што творы ў друкаванай форме адрозніваюцца ад электронных толькі фарматам запісу тэксту. Але даследчыкамі ўжо высветлена, што электронныя кнігі ўспрымаюцца некалькі горш, чым у друкаваным відзе. Цікава, што вытлумачваецца гэты факт тым, што запамінанне інфармацыі паляпшаецца пры перагортванні старонак, калі тактыльнасць аб'ядноўвае і ўзмацняе працу скуры, нервовай сістэмы і мозгу. І гэта не адзіны доказ. Менавіта таму, абмяркоўваючы такія факты з вучнямі, можна пераконваць іх ў карысці чытання. Такой пазіцыі прытрымліваюцца многія настаўнікі. А яшчэ, на думку Прышчэпчык Святланы Пятроўны, якая выкладае беларускую мову і літаратуру ў СШ № 12 імя У. Бабко і яе калег, важна, абмяркоўваючы кнігу, нацэльваць вучняў на роздум, выказванне сваіх меркаванняў, своеасаблівае дабудоўванне ўражанняў і ўласную творчасць. Напрыклад, прачытанае пра юбілеі ў гэтым годзе і абмеркаванае пабудзіла яе вучняў да асабістых разважанняў і даследванняў, што і ўвасобіліся ў іх эсэ.

Некалькі з іх мы прапануем вашай увазе.

*Алена Руцкая*
*член Саюза пісьменнікаў Беларусі,*
*Заслужаны настаўнік Беларусі*

***Казячы Аляксей***
*11 клас*

# Непарыўны ланцужок памяці

Ужо 85 гадоў аддзяляе нас ад адной з самых крывавых трагедый 20-га стагоддзя, ад жудаснага ранку, калі на нашу зямлю вераломна рынуліся фашысцкія полчышчы, калі нашы гераічныя заставы ўступілі ў няроўны бой з лютым ворагам. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Пра той час мы, маладое пакаленне, ведаем з падручнікаў гісторыі, з літаратурных твораў, з аповедаў удзельнікаў бітваў і сведкаў таго ліхалецця, якіх, на жаль, засталося вельмі мала. І я лічу, што наш абавязак – свята захоўваць усё тое, што мы даведаліся ад сваіх продкаў, а таму і хачу падзяліцца ўспамінамі маіх родных, прадзядуль і прабабуль, на долю якіх выпала быць сведкамі тых страшных падзей.

Майму прадзядулю, Казячаму Мікалаю Іванавічу, было ў 1941-м дзевятнаццаць, ён ваяваў і быў паранены. Пра яго апавядаюць старонкі ў кнізе “Памяць” Мастоўскага раёна.

Мая прабабуля, Казячая Марыя Ігнацьеўна, нарадзілася ў вёсцы Княжаводцы Мастоўскага раёна. У Княжаводцах нарадзіўся ўжо і мой дзядуля, а таму я лічу, што гэта і мая малая радзіма.

Княжаводцы напаткаў лёс Хатыні. Да вайны там жыло каля тысячы чалавек. Дзядуля мне расказаў, што жыхары вёскі актыўна дапамагалі партызанам. Перадавалі знойдзеную ў лясах зброю, прадукты харчавання, адзенне. А летам 1943 года побач з вёскай па дарозе на Гродна быў знішчаны партызанамі аўтамабіль з нямецкімі афіцэрамі. У якасці помсты раніцай 23 ліпеня вёску акружылі карнікі, жыхароў сагналі ў дзве пабудовы на ўскрайку. Іх пасля падпалілі, а людзей расстралялі. Тых жыхароў, якім удалося ўцячы, прытулілі ў сябе людзі з суседніх вёсак. І пра гэта мне ўжо расказала другая мая бабуля, якая была родам з Сарочыц. Яе маці, мая другая прабабуля, якраз і дапамагала тым, каму ўдалося ўратавацца. Жыхарка Княжаводцаў Алена Слуцкая так ўспаміналa пра тыя страшныя падзеі. Яна расказвала, што калі пайшлі чуткі, што немцы збіраюцца чыніць расправу над Княжаводцамі, то людзі пачалі вартаваць вёску па чарзе. Неўзабаве нехта паведаміў, што немцы ўжо збіраюцца непадалёку ў лесе. Пачуўшы пра гэта, у той вечар яе маці доўга не магла заснуць, сядзела каля акна і чула, як рухаліся ў лес машыны. А ўжо змрокам прыйшоў бацька. Яны не запальвалі святла, апрануліся і пайшлі ў поле. Вёска яшчэ не была акружана. Рухаліся крадучыся, моўчкі і так сталася, што Алена адбілася ад сваіх. Патрапіла на хутар да знаёмых, а раніцай вырашыла вярнуцца ў вёску. Здалёк убачыла, што

з лесу выходзяць немцы і акружаюць дамы. Хаваючыся адышла і далучылася да Вольгі Барадаўкі, якая з дочкамі кіравалася ў Чарлёнку. Калі ўбачылі, што і адтуль у Княжаводцы едуць падводы, а на іх – чужыя людзі, то вырашылі ісці ў Сарочыцы. Алена была толькі ў тым, у чым выйшла з хаты, нават кавалка хлеба не мела. Яе прытулілі добрыя людзі. А ўсіх родных, што засталіся ў Княжаводцах, у той дзень немцы забілі. Толькі бацька яе застаўся жывы, бо схаваўся ў жыце і яго не заўважылі.

Мая прабабуля Юля добра памятала гэтых дзяўчатак з Княжаводцаў, што напалоханыя і знясіленыя папрасілі прытулку, і яе бацькі прынялі іх як блізкіх, хаця ў той час гэта было рызыкоўна. Яна не раз расказвала пра гэты выпадак сваёй дачцэ, ужо маёй бабулі, а яна расказала мне. Такі вось атрымліваецца ланцужок памяці.

У 1958 годзе ў Княжаводцах быў устаноўлены помнік загінуўшым. Кожны год 23 ліпеня ля помніка праходзіць мітынг-рэквіем. Сюды з’язджаюцца родныя тых людзей, каго напаткаў такі страшны лёс. Калі была жывая прабабуля Марыя, то яна таксама заўсёды ездзіла туды. А калі яе не стала, наведваць вёску працягвае наша сям’я, бо вельмі важна, каб памяць пра гэтыя падзеі перадавалася з пакалення ў пакаленне. Чалавецтва павінна памятаць аб ахвярах вайны, памятаць аб злачынствах, якім няма апраўдання, памятаць пра мінулае і клапаціцца пра будучыню.

Калі стаіш ля таго помніка (ён мае назву “Маці смуткуе”), то яшчэ больш разумееш, як важна, каб не абрываўся ланцужок памяці, і якое гэта вялікае шчасце жыць у нашым мірным і спакойным краі, нашай Беларусі.



*Аўчыннікаў Васіль*
*11 клас*

# Незабыўнае

Кожнаму чалавеку ўласціва надаваць асаблівую ўвагу родным ці знакавым для яго мясцінам. Напэўна таму, калі ў класе зайшла размова пра юбілеі, мне прыгадалася мястэчка Любча, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны жыла мая прабабуля Шайбак Матрона Маркаўна (1933 г. н.).

Размова пра сёлетні юбілей Фрацыска Скарыны, пра кнігадрукаванне, пра старажытныя друкарні выклікала ўспамін пра Любчу. Узгадалася прыгожая легенда пра ўзнікненне мястэчка, аповеды пра гісторыю велічнага замка на крутым беразе Нёмана, пра старажытную друкарню. Успомніўся стары парк, храмы, плошча, вакол якой, па аповедах старых жыхароў, месціліся яўрэйскія магазінчыкі з багатым выбарам розных тавараў. Уявілася мірнае жыццё мястэчка з яго клопатамі, радасцямі, святамі і буднямі.

І зусім іншы і вельмі горкі ўспамін прынесла размова пра другі юбілей – 85 год з дня, калі мірнае жыццё нашай краіны было абарвана выбухамі бомбаў і снарадаў, калі фашысты вераломна напалі на нашу дзяржаву. Разбурэнне і смерць несла гэта карычневая чума паўсюль. Не мінула яна і Любчы.

З горкіх успамінаў маёй прабабулі Матроны Маркаўны пра той час асабліва балюча ўрэзаліся мне ў памяць расказы пра расправы над мірным насельніцтвам.

Са слязамі на вачах прабабуля расказвала, як у час адной з аблаў на яўрэяў (іх часта праводзілі ў мястэчку фашысты) з натоўпу выбегла дзяўчынка гадоў чатырох. Малую падхапіў на рукі нямецкі афіцэр, пагладзіў па галоўцы, дастаў з кішэні цукерку і паклаў ёй у руку. Дзяўчынка абняла афіцэра за шыю, супакоілася і засмяялася. Фашыст аднёс малую ў натоўп напалоханых і знясіленых жанчын, старых і дзяцей і …застрэліў на вачах у маці.

Калі я пачуў гэты расказ, то нават усвядоміць не мог, што чалавек можа быць здольны на такое цынічнае зверства. Стараўся неяк растлумачыць сабе, што кіравала гэтым чалавекам. Хаця чалавекам нават назваць яго нельга. Успомніў пра памятку для фашысцкіх салдат, пра яе змест расказвала нам настаўніца гісторыі. У той памятцы пісалася, што ў салдат фюрэра не павінна быць ніякай жаласці ні да кога, што яны павінны забіваць усіх, бо гэта ворагі, якія гатовы забіць кожнага з іх. Пісалася, што Бог бласлаўляе іх. І калі яны вернуцца з перамогай, то іх будуць вітаць як вялікіх і слаўных герояў.

Падумалася, што, можа, на хвіліну ў гэтага афіцэра абудзілася нешта чалавечнае, а пасля ён успомніў тую памятку. Або пабаяўся за свой учынак (пагладзіў, даў цукерку) перад другімі карнікамі і так рэабілітаваўся. А можа хацеў паказаць сваю ўладу – хачу мілую, хачу караю. Ці ён проста нелюдзь, якому, як і яму падобным, няма апраўдання, і злачынствы іх не могуць мець тэрміну даўнасці.

Мурына Вераніка
11 клас

# Магія пісьменніцкага слова

Невялікае памяшканне нашай школьнай бібліятэкі заўсёды напоўнена ўтульнасцю. Тут камфортна, ціха і прыгожа. Прыгажосці надае афармленне: хораша абсталяваныя тэматычныя палічкі, яркія рэкламкі літаратурных навінак і цікавыя выставы.

У той дзень я была вызвалена ад фізкультуры і адпрасілася ў бібліятэку. Ішлі ўрокі, і ў ёй не было нікога акрамя бібліятэкаркі і старой жанчыны, якая працавала тут раней і заходзіла часам, як яна казала, па старой памяці.

Я адразу заўважыла новую выставу. Увагу прыцягвалі загаловак «105-годдзе» і добра знаёмы партрэт пісьменніка Івана Шамякіна, а яшчэ буйным шрыфтам пададзеныя даты яго жыцця і цытата: «Для яго былі тры каштоўнасці: Радзіма, сям’я, літаратура». Шчыра сказаць, цытата спачатку мяне не ўразіла. Падалося, што неяк вельмі агульна, проста. Нават намерылася выказаць гэта бібліятэкарцы. Перачытала для пэўнасці і сумелася. А сапраўды… Хіба Радзіма, сям’я не найважнейшыя каштоўнасці? А літаратура? Калі ты пісьменнік і гэта твая справа, то як інакш можна да яе ставіцца? Уразіў і лічбавы рахунак творчасці: 12 раманаў, 26 аповесцей, 80 апавяданняў, 10 п’ес, 230 кніг на 30 мовах, 25 мільёнаў экземпляраў кніг.

Ад здзіўлення я, відаць, прагаварыла гэту лічбу ўслых, бо госця сказала:

– Вось і я не перастаю здзіўляцца. Столькі напісана, а дакладней сказаць, перажыта, перадумана і напісана, бо не дарма ж Іван Шамякін адзін з самых чытаемых пісьменнікаў. Калі я была такой як ты, добрыя кнігі былі нарасхват.

Памятаю, як у нашым пасёлку, каля нашай маленькай кнігарні выстройвалася вялікая чарга, калі даведваліся, што з’явілася новая кніга Шамякіна. Калі бяру ў рукі кнігу «Сэрца на далоні», то заўсёды прыгадваю даўні выпадак, як я аканфузілася. Выйшаў гэты раман. Нашай кнігараньцы дасталіся толькі дзве ўпакоўкі па 10 кніг. Прадаўшчыца была ў роспачы. Людзі набеглі адразу. Такі гвалт быў. Падавалі грошы, хапалі кнігу і нават рэшту забываліся ад радасці ўзяць. Разабралі тыя 20 экземпляраў за некалькі хвілін, а народ усё ішоў. Прадаўшчыца папрасіла мяне напісаць на лістку абвестку, што кніг больш няма, і хуценька прымацаваць на дзверы. Вось я ў спешцы і напісала: «Сэрцаў на далоні» больш няма. Доўга пасля са смехам гэту абвестку ўспаміналі, але прадаўшчыца мяне не выдала, а сказала, што гэта напісаў хтосьці з пакупнікоў.

Яна крыху памаўчала і дадала, што раман «Крыніцы» яны вывучалі ў школе і нават на памяць вучылі ўрывак пра Алёшу Касцянка, які ў час летніх канікул працаваў на камбайне, бо камбайнераў у калгасе не хапала. Мы чыталі і ўсе захапляліся гэтым героем.

Аповед жанчыны ўразіў мяне, і я спытала, ці ёсць гэты раман у нашай бібліятэцы. Праз некалькі хвілін я ўжо гартала старонкі рамана «Крыніцы». Знайшла ўрывак, які згадваўся. Чытала яго, і радкі абуджалі ў маёй памяці самыя светлыя і цёплыя ўспаміны пра жнівень у вёсцы. Перада мной узнікаў малюнак поля ў залатых хвалях паспелага жыта. Я нібы зноў адчула той асаблівы пах – пах нагрэтай сонцам саломы, свежага, толькі што змалочанага зерня. А яшчэ я ўспомніла свайго дзядулю, успомніла, як бегалі на ўскраек поля і з захапленнем глядзелі, як магутныя чырвоныя машыны, падобныя да казачных караблёў, павольна плылі па залатым моры пшаніцы. І так хацелася хоць крышачку пасядзець у кабіне гэтага карабля. Чытаючы радкі Івана Шамякіна, я яскрава ўяўляла поле і, здавалася, чула шум калосся, якое «кланяецца камбайну». Гэта было не проста апісанне яркім мастацкім словам сельскагаспадарчай працы, гэта было адлюстраванне магіі нараджэння хлеба.

Мяне вельмі крануў момант, дзе герой любуецца «жывым і вясёлым струменем збожжа». Чытала і перачытвала ўрывак, і ўзнікала пачуццё, якое цяжка перадаць словамі. Гэта быў і гонар за сваю зямлю, і глыбокая павага да працы хлебароба. А яшчэ гэты ўрывак нараджаў ў сэрцы вялікую ўдзячнасць аўтару, знакамітаму пісьменніку, за тое, што так паэтычна прамовіў пра харавство роднай зямлі, каштоўнасць працы, цану хлеба, важнасць імкненняў да здзяйснення мар.

